**УДК 392:273.2(476.5)** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-66-1-76-82**

# СТАРАВЕРСКІЯ АБШЧЫНЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1945 – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1950-х гг.

***канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6433-0039***

*Артыкул прысвечаны гісторыі стараверскіх абшчын Віцебскай вобласці ў 1945 – першай палове 1950-х гг. На аснове архіўных матэрыялаў разгледжаны іх стан у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Гэты перыяд характарызуецца неаднароднасцю дзяржаўна-канфесійнай палітыкі ў савецкай дзяржаве. Калі адразу пасля вайны назіраецца аднаўленне рэлігійнага жыцця, то ўжо ў канцы 1940-х гг. наступае перыяд яго згортвання. У артыкуле прааналізаваны працэсы аднаўлення рэлігійнага жыцця ў стараверскіх абшчынах, разгледжаны працэс іх афіцыйнай рэгістрацыі ў згаданы перыяд, выяўлены змены ў дзяржаўнай палітыцы ў адносінах стараверскіх абшчын рэгіёна ў канцы 1940-х гг. Асаблівая ўвага звернута на палітыцы савецкай улады ў пытаннях закрыцця стараверскіх храмаў і спыненні дзейнасці абшчын у канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. Ахарактарызаваны некаторыя дэмаграфічныя паказчыкі, разгледжаны асаблівасці тэрытарыяльнага размяшчэння абшчын і рассялення стараveraў у Паўночна-Усходняй Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.*

***Ключавыя словы:*** *стараверы, рэлігійныя абшчыны, этнічныя групы, БССР, Віцебшчына, дзяржаўная палітыка.*

**Уводзіны.** Паўночна-Усходні рэгіён Беларусі з’яўляецца адным з гістарычных цэнтраў стараверства ў краіне. За працяглы перыяд на гэтай тэрыторыі сфарміравалася даволі кампактная зона пасялення рускіх старавераў (асноўны масіў населеных пунктаў размяшчаецца ў межах сучасных Полацкага, Віцебскага, Шумілінскага, Бешанковіцкага і Чашніцкага раёнаў Віцебскай вобласці). У беларускай гістарыяграфіі стараверства Усходняга Падзвіння даследавана даволі неаднародна. Калі стараверам рэгіёна ў ХІХ – пачатку ХХ ст. яшчэ прысвечаны шэраг прац (у першую чаргу вылучаюцца даследаванні А.А. Гарбацкага [1]), то па іншых перыядах яны практычна адсутнічаюць. Да ліку малараспрацаваных пытанняў адносіцца і гісторыя стараверскіх абшчын у рэгіёне ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. Некаторыя аспекты гэтай праблематыкі знаходзім толькі ў працы В.У. Друзёнак “Старообрядческие объединения города Витебска в середине 1940-х – середине 1960-х годов” [2].

*Мэта* дадзенага артыкула – разгледзець стан стараверскіх абшчын Усходняй Віцебшчыны ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945 – сярэдзіна 1950-х гг.). Рэгіён даследавання будзе складаць тэрыторыя Віцебскай вобласці[1] ў межах таго часу (малюнак 1). Асновай для даследавання стаў комплекс матэрыялаў Дзяржаўнага архіву Віцебскай вобласці (фонды 1439 і 4029).




**Малюнак 1. – Віцебская вобласць у 1946–1954 гг.**

---

[1] Віцебская вобласць была ўтворана яшчэ ў 1938 г., але ў 1944 г. яе заходнія раёны (Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Полацкі, Расонскі і Ушацкі) былі далучаны да арганізаванай у гэтым годзе Полацкай вобласці. А праз два гады, у 1946 г., адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Віцебскай вобласці зведаў некаторыя змены (створаны Каханаўскі, Арэхаўскі і Ульскі р-ны).

**Асноўная частка.** Антырэлігійная палітыка савецкіх улад у 1920-я – 1930-я гг. прывяла да масавага закрыцця стараверскіх храмаў і афіцыйнага спынення дзейнасці іх абшчын на тэрыторыі Паўночна-Усходняй Беларусі. Аднак у часы Вялікай Айчыннай вайны рэлігійнае жыццё ў стараверскіх абшчынах аднаўляецца. У гады вайны зноў адчыніліся храмы і аднавілі сваю дзейнасць амаль усе абшчыны рэгіёна. У пасляваенны перыяд назіраецца больш ліберальная палітыка ў дачыненні да рэлігіі і царквы, чым у даваенны. Былая жорсткая антырэлігійная палітыка была заменена на больш узважаную палітыку "прымірэння". Лібералізацыя царкоўнага жыцця ў СССР намецілася яшчэ ў часы вайны. Былі нават утвораны адпаведныя структуры, якія ажыццяўлялі сувязь паміж дзяржаўнымі органамі і рэлігійнымі аб'яднаннямі. Так, 14 верасня 1943 г. была прынята пастанова СНК "Аб арганізацыі Савета па справах Рускай Праваслаўнай царквы". А для ажыццяўлення ўзаемаадносін паміж уладамі і рэлігійнымі аб'яднаннямі, якія не ўваходзілі ў РПЦ, у маі 1944 г. быў утвораны Савет па справах рэлігійных культаў (ССРК). Гэтыя два органы павінны былі каардынаваць і кантраляваць дзейнасць рэлігійных арганізацый. Менавіта апошні адказваў за кантроль над стараверскай царквой у СССР. Акрамя цэнтральнага ССРК на месцах, у т.л. пры СНК БССР (з 1946 г. – пры Савеце Міністраў) і абласных выканкамах, фарміруецца інстытут упаўнаважаных Савета. У гэты перыяд была створана нарматыўна-прававая база, якая давала магчымасць рэлігійным арганізацыям атрымаць афіцыйную рэгістрацыю і дзейнічаць легальна.

Ва ўсходняй частцы Віцебшчыны адразу пасля заканчэння вайны налічвалася значная колькасць стараверскіх абшчын, дзейнасць якіх аднавілася яшчэ у 1941 г. з пачаткам вайны. Пасля 1945 г. многія абшчыны Віцебскай вобласці накіравалі заявы на афіцыйную рэгістрацыю. Аднак, як сведчаць архіўныя крыніцы, на пачатку ўзніклі некаторыя цяжкасці з іх рэгістрацыяй. Справа ў тым, што ў адпаведнасці з інструктыўным пісьмом ССРК пры СНК СССР ад 22 лютага 1945 г. для рэгістрацыі абшчына павінна была мець святара, зацверджанага адпаведным рэлігійным цэнтрам. А ў якасці такіх прызнаных афіцыйных цэнтраў у гэтай жа інструкцыі гаворка вялася толькі пра старавераў-папоўцаў белакрыніцкага сагласу [12, арк. 16]. Але пераважная большасць стараверскіх супольнасцей рэгіёна ў гэты перыяд былі беспапоўскімі паморскімі, якія не мелі такіх "цэнтраў". Гэта асаблівасць выклікала пытанні ва ўпаўнаважанага ССРК па Віцебскай вобласці Ф.М. Ляхава і ў чэрвені 1945 г. ён звяртаўся за тлумачэннямі ў Савет па справах рэлігійных культаў пры СНК БССР: "В связи с тем, что территории Витебской области в исключительном большинстве преобладают старообрядческие религиозные общины поморского направления, так называемые беспоповцы, которые подали заявления об регистрации их общин и ходатойствуют об открытии молитвенного здания. Поэтому прошу Вашего указания о методах регистрации указанных религиозных общин, так как последние <…> своего религиозного центра не имеют. Священники этих религиозных общин никакого духовного образования и подтверждающих документов об их назначении также не имеют, а избираются на общих собраниях верующих" [12, арк. 16]. Гэта акалічнасць, па словах упаўнаважанага, "задерживает своевременное реагирование на ходатайство верующих" [12, арк. 23]. Таму рэгістрацыя стараверскіх абшчын у Віцебскай вобласці пачалася толькі ў другой палове 1945 г.

Як сведчаць архіўныя крыніцы, на працягу другой паловы 1945 г. і першай паловы 1946 г. на тэрыторыі Віцебскай вобласці большасць стараверскіх абшчын была ўжо зарэгістравана (табліца 1). Так, на 1 ліпеня 1946 г. на тэрыторыі Віцебскай вобласці дзейнічала 11 зарэгістраваных абшчын, яшчэ 5 былі незарэгістраваныя. Усе гэтыя абшчыны размяшчаліся ў Сіроцінскім (7), Чашніцкім (3), Бешанковіцкім (3), Віцебскім (1) раёнах і г. Віцебску (2). Разам з тым, па сведчанні афіцыйных улад, у в. Слабада Бешанковіцкага р-на існавалі яшчэ 2 групы старавераў (адна беспапоўцаў-паморцаў, а другая папоўцаў белакрыніцкага сагласу), але намаганняў па рэгістрацыі абшчын яны не прадпрымалі [13, арк. 20].

Табліца 1. – Стараверскія абшчыны на тэрыторыі Віцебскай вобласці (па стану на 1 ліпеня 1946 г.)

| № | Месцазнаходжанне абшчыны | Наяўнасць (+) / адсутнасць (–) малітоўнага дома | Колькасць вернікаў | Дата рэгістрацыі (калі маецца) |
|---|---|---|---|---|
| | | *Чашніцкі р-н* | | |
| 1 | в. Зазерыца | + | 59 | 25.06.1946 |
| 2 | в. Бор | – | 45 | не зарэгістравана |
| 3 | в. Должыца | – | 37 | не зарэгістравана |
| | | *Сіроцінскі р-н* | | |
| 4 | в. Латкова | + | 100 | не зарэгістравана |
| 5 | в. Сідараўшчына | – | 120 | не зарэгістравана |
| 6 | в. Жалудова | – | 200 | не зарэгістравана |
| 7 | в. Добрына | – | 200 | 12.12.1945 |
| 8 | в. Забор'е | + | 89 | 25.06.1945 |
| 9 | в. Плюшчоўка | + | 152 | 05.12.1945 |
| 10 | пас. Шуміліна | + | 160 | 12.12.1945 |
| | | *Бешанковіцкі р-н* | | |
| 11 | в. Светагорава | + | 57 | 12.06.1946 |
| 12 | в. Застарынне | + | 107 | 20.12.1945 |
| 13 | в. Плісы | + | 300 | 20.06.1946 |
| | | *Віцебскі р-н* | | |
| 14 | в. Грышаны | + | 210 | 25.08.1945 |
| | | *г. Віцебск* | | |
| 15 | г. Віцебск , "Юр'ева Горка" | + | 120 | 20.08.1945 |
| 16 | г. Віцебск, Тарны камбінат | + | 80 | 27.12.1945 |

*Крыніца:* складзена аўтарам на аснове [13, арк. 18-20].

Як вынікае з аналізу архіўных матэрыялаў, адной з галоўных прычын, па якой не адбывалася афіцыйная рэгістрацыя шэрагу стараверскіх абшчын, з'яўлялася адсутнасць малітоўнага дома. Таму нярэдка не толькі ў першыя пасляваенныя гады, але і на працягу наступных перыядаў адсутнасць у старавераў асобнага малітоўнага памяшкання з'яўлялася перашкодай да рэгістрацыі, або прычынай зняцця з рэгістрацыі абшчын, якія раней былі зарэгістраваны. Аднак ужо да канца 1946 г. большасць абшчын Віцебскай вобласці была зарэгістраванай. За апошнія два месяцы 1946 г. афіцыйную рэгістрацыю атрымалі абшчыны ў в. Бор Чашніцкага раёна, вв. Латкова, Сідараўшчына і Жалудова Сіроцінскага раёна. Такім чынам, на канец 1946 г. на тэрыторыі Віцебскай вобласці было зарэгістравана 15 абшчын старавераў-беспапоўцаў, якія дзейнічалі ў Сіроцінскім раёне (6), Чашніцкім (2), Бешанковіцкім (4), Ульскім (1), Віцебскім раёне (1) і г. Віцебску (2) [14, арк. 19]. Такім чынам, на працягу 1945–1946 гг. на тэрыторыі Віцебскай вобласці амаль усе дзеючыя абшчыны атрымалі рэгістрацыю. Толькі Должыцкая абшчына ў Чашніцкім раёне не была зарэгістравана. Пры гэтым трэба заўважыць, што не ўсе з зарэгістраваных абшчын мелі ў гэты час асобныя храмы. Так, згодна з данымі ўпаўнаважанага па Віцебскай вобласці за II квартал 1947 г., шэраг абшчын сваіх храмаў не мелі і арэндавалі малітоўныя памяшканні, якія адначасова з'яўляліся і жылымі дамамі. Такая сітуацыя была характэрна для старавераў у пас. Шуміліна, вв. Добрына і Забор'е Сіроцінскага раёна. Але пры гэтым адзначалася, што Сідараўшчынская, Добрынская і Шумілінская абшчыны будуюць малітоўныя дамы [14, арк. 19].

У гэты перыяд у вобласці агульная колькасць вернікаў-старавераў, як вынікае з афіцыйных падлікаў, была даволі малой. Так, на сярэдзіну 1946 г. у вобласці іх налічвалася толькі 2 036 чалавек (гл. табліцу 1). Афіцыйная статыстыка за наступны 1947 г. прадстаўляла прыкладна такую ж колькасць (амаль па ўсіх абшчынах вобласці пададзены такія ж даныя, як і за 1946 г.). Толькі ў абшчыне в. Забор'е Сіроцінскага раёна колькасць вернікаў павялічылася з 89 чалавек у 1946 г. да 150 у 1947 г. [14, арк. 21–23]. Аднак, як вынікае з аналізу гэтых даных, такая афіцыйная колькасць прыхажан значна ніжэйшая за рэальную колькасць стараверскага насельніцтва на тэрыторыі вобласці. Па-першае, ва ўсіх гэтых даных гаворка вядзецца выключна пра прыхажан абшчыны, а не прадстаўнікоў этнаканфесійнай супольнасці канкрэтнай мясцовасці. Па-другое, звяртае на сябе ўвагу ўмоўнасць (прыблізная акругленая колькасць) даных. А ў тых выпадках, дзе лічбы прадстаўлены не акругленыя, часцей гаворка вядзецца пра афіцыйна прадстаўленую ў дакументах абшчыны колькасць прыхажан, якая часта не адпавядала рэальнай колькасці прыхільнікаў старых абрадаў. Нярэдка, гэта лічба фарміравалася на аснове колькасці вернікаў, якія падпісалі заяву на рэгістрацыю абшчыны. Так, у Застарынскай абшчыне Бешанковіцкага раёна афіцыйныя даныя на 1946 і 1947 гг. сведчылі толькі пра 107 прыхажан. У той жа час заяву на рэгістрацыю абшчыны, пададзеную ў 1945 г., падпісалі ўсё тыя ж 107 чалавек. Такая ж колькасць вернікаў прысутнічала і на агульным сходзе абшчыны, дзе і прымалася рашэнне аб яе рэгістрацыі [3, арк. 2, арк. 6-7аб]. А паколькі рэгістрацыя рэлігійнага аб'яднання была магчымая, калі яго колькасць была не менш за 20 чалавек, то і колькасць падпісаўшых заяву на рэгістрацыю часта была невялікай.

Па-трэцяе, на аснове аналізу архіўных крыніц становіцца відавочным паўсюднае заніжэнне колькасці вернікаў-старавераў у справаздачах упаўнаважаных ССРК у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Але нават у гэтых справаздачах нярэдка ўказвалася куды большая колькасць прыхільнікаў старых абрадаў. Так, згодна з данымі на 1946 і 1947 гг., у Добрынскай абшчыне налічвалася 160 членаў, у Шумілінскай – 160, у Сідараўшчынскай – 120. У той жа час даныя з іншай справаздачы за 1947 г. падаюць куды большыя лічбы. Згодна з імі Добрынская абшчына налічвала 400 гаспадарак, Шумілінская – 250, Сідараўшчынская – 150 [АВВ, ф. 4029. Воп. 2., спр. 3., арк. 19]. Паўсюднае заніжэнне колькасці стараверскага насельніцтва праяўляецца і пры аналізе афіцыйных даных больш позніх перыядаў. У гэтым плане даволі паказальны прыклад з колькасцю вернікаў у Светагораўскай абшчыне Бешанковіцкага раёна. У канцы 1950-х гг. у спісе вернікаў значылася звыш 400 чалавек (гэта ўжо пасля аб'яднання з Пліскай і Застарынскай абшчынамі). Аднак у афіцыйных крыніцах гэтага перыяду колькасць вернікаў, якія наведваюць храм на святы, складала толькі каля 150–200 чалавек [4, арк. 24-27аб, арк. 43].

На малюнку 2 прадстаўлена геаграфія размяшчэння зарэгістраваных стараверскіх абшчын на тэрыторыі Віцебскай вобласці па стане на пачатак 1947 г. Як вынікае з аналізу крыніц, у гэты перыяд у рэгіёне функцыянавалі ранейшыя гістарычныя цэнтры стараверства, а асноўныя рэгіёны кампактнага пражывання старавераў (і дзейнасці іх абшчын) па-ранейшаму размяшчаліся на тых жа тэрыторыях (у адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам 1945–1954 гг. гэта Сіроцінскі, Бешанковіцкі, Чашніцкі і Віцебскі р-ны).

У пасляваенны перыяд значным цэнтрам стараверства ў рэгіёне заставаўся г. Віцебск. У горадзе ў гэты час дзейнічала дзве зарэгістраваныя абшчыны старавераў-беспапоўцаў і дзве незарэгістраваныя (адна беспапоўцаў і адна – папоўцаў белакрыніцкага сагласу). Яшчэ адна абшчына старавераў-беспапоўцаў функцыянавала ў в. Грышаны (каля самага Віцебска).

Найбольш значным цэнтрам стараверства ў пасляваенны перыяд у Віцебску была абшчына на тэрыторыі Чыгуначнага раёна. У народзе гэты раён атрымаў назву "Юр'ева Горка", а таму ў дакументах гэта стараверскае рэлігійнае аб'яднанне часта ўказвалася з такой жа назвай. Рэлігійнае аб'яднанне было зарэгістравана яшчэ ў 1945 г. Малітоўны дом, які размяшчаўся па адрасе вул. 3-я Малатава, № 1, пры савецкай уладзе афіцыйна пачаў працу з кастрычніка 1944 г. У гэты перыяд духоўным настаўнікам быў Васілій Цімафеевіч Мінін, а з 1948 г. – Васіль Іванавіч Красікаў [8, арк. 13]. У пасляваенны перыяд у Чыгуначным раёне Віцебска функцыянавалі і стараверскія могілкі [8, арк. 12]. Афіцыйныя крыніцы паведамляюць пра даволі малую колькасць членаў гэтай абшчыны: па даных 1946 г. – 120 чалавек (гл. табліцу 1). Гэта стараверская абшчына была адзінай, якая заставалася афіцыйна зарэгістраванай у горадзе ў 1950-я – 1980-я гг.




**Малюнак 2. – Карта-схема размяшчэння стараверскіх абшчын на тэрыторыі Віцебскай вобласці па даных на 1947 г.**

*Заўвага:* складзена аўтарам на аснове [14, арк. 21–23]; нумары на карце адпавядаюць парадкаваму нумару ў табліцы 1).

У тым жа 1945 г. у Віцебску была зарэгістравана яшчэ адна стараверская абшчына ў раёне Тарнага камбіната (малітоўны дом знаходзіўся па адрасе вул. 4-я Тарная, дом к-8). Па колькасці прыхажан гэта абшчына была меншая, чым на "Юр'евай Горцы": згодна з афіцыйнымі данымі на 1946 г. – 80 чалавек (гл. табліцу 1). Аднак ужо ў 1948 г. абшчына спыняе сваю дзейнасць (спачатку была накладзена часовая забарона, а потым і поўная). Фармальнай перашкодай для далейшай дзейнасці абшчыны стала адабранне ў яе малітоўнага дома. Стараверская абшчына гэты дом набывала ў 1942 г., у часы нямецкай акупацыі, а таму ў афіцыйных дакументах пасляваеннага перыяду гэта набыццё характарызавалася як заняцце "без должных оснований". І ў выніку суд вынес рашэнне вярнуць гэты дом былому ўладальніку [9, арк. 3, арк. 6].

Яшчэ адна абшчына ("Узгорская") стараавераў-беспапоўцаў дзейнічала ў Віцебску ў раёне швейнай фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі". Яна функцыянавала да 1932 г., калі яе храм быў зачынены Віцебскім гарсаветам. З пачаткам вайны храм ізноў быў адчынены і ў 1941 г., у ім быў нават праведзены капітальны рамонт [6, арк. 21], аднак пасля вайны храм быў заняты пад жыллё рабочымі швейнай фабрыкі. У сваю чаргу прыхажане абшчыны звярталіся да ўладаў з просьбамі вярнуць ім храм ці выдзеліць іншае памяшканне для правядзення богаслужэнняў [7, арк. 31]. 6 жніўня 1946 г. выканаўчы камітэт Віцебскага аблсавета дэпутатаў працоўных канчаткова адмовіў у хадайніцтве Узгорскай абшчыне. У якасці аргументацыі было ўказана тое, што ў Віцебску ўжо маюцца два стараверскія храмы: "Исходя из того, что в г. Витебске уже функционируют два молитвенных дома общины поморцев-беспоповцев на "Юрьевой горке" и "Тарном комбинате", которые имеют полную возможность обслуживать всех верующих гор. Витебска" [7, арк. 32].

Такім чынам, ужо ў канцы 1940-х гг. у Віцебску засталася толькі адна зарэгістраваная стараверская абшчына – абшчына беспапоўцаў паморскага сагласу на "Юр'евай Горцы". Да яе таксама была далучана і абшчына ў в. Грышаны Віцебскага раёна [9, арк. 21].

У пасляваенны перыяд у Віцебску фіксавалася і абшчына стараавераў-папоўцаў белакрыніцкага сагласу. Як вынікае з крыніц, яна дзейнічала да 1932 г., а потым была знята з рэгістрацыі. У перыяд акупацыі гэта абшчына аднавіла сваю дзейнасць і функцыянавала да 1944 г. [5, арк. 3]. Абшчына ў першыя пасляваенныя гады не была зарэгістравана. Заява на рэгістрацыю ад вернікаў-стараавераў белакрыніцкага сагласу г. Віцебска і ваколіц паступіла толькі ў 1954 г. [10, арк. 16–16адв.], Аднак у рэгістрацыі ім было адмоўлена. У якасці прычын адмовы выступіла тое, што абшчына не мае малітоўнага дома [15, арк. 86, арк. 87]. Разам з тым, пры праверцы подпісаў, пастаўленых пад заявай на рэгістрацыю, выявіліся факты іх падробкі [10, арк. 51–51адв.]. У наступныя гады абшчына прадпрымала спробы атрымаць афіцыйны статус. І толькі ў 1989 г. быў дадзены дазвол на рэгістрацыю, а ў 1991 г. яна была зарэгістравана [3, арк. 8, арк. 12, арк. 13].

У Паўночна-Усходняй Беларусі адным з гістарычных цэнтраў стараверства з'яўляецца тэрыторыя сучаснага Шумілінскага р-на (да 1961 г. меў назву Сіроцінскага р-на). Па-ранейшаму, рэгіён з'яўляўся адным з лідараў як па колькасці стараверскага насельніцтва, так і па ліку іх рэлігійных аб'яднанняў. На 1945 г. у межах раёна налічвалася 7 стараверскіх абшчын (у вв. Добрына, Плюшчоўка, Забор'е, Латкова, Сідараўшчына, Жалудова, пас. Шуміліна). Згодна з данымі на 1946 г. у Сіроцінскім раёне налічвалася 6 стараверскіх абшчын (у сувязі з адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі зменамі ў 1946 г. абшчына ў в. Жалудова стала адносіцца да Ульскага р-на). Да канца 1946 г. усе шэсць стараверскіх абшчын раёна былі зарэгістраваны.

Як вынікае з аналізу матэрыялаў, стараверы даволі кампактна прыжывалі ў межах Сіроцінскага раёна. Своеасаблівым цэнтрам старaверства ў раёне быў Лаўжанскі с/с, на тэрыторыі якога дзейнічала 3 абшчыны (Латкоўская, Добрынская і Сідараўшчынская). У сваю чаргу, Плюшчоўская абшчына размяшчалася ў Амбросавіцкім с/с, а Заборская – у Дабейскім. Сітуацыю з рассяленнем старавераў у межах раёна ілюструюць і функцыянуючыя ў той час могілкі. Так, згодна з данымі на 1946 г., у Сіроцінскім раёне налічвалася 13 стараверскіх могілак, з іх у Лаўжанскім с/с – 4, Спаскім с/с – 2, Дабейскім с/с – 2, Шумілінскім с/с – 2, Амбросавіцкім с/с – 1, Обальскім – 1, Казьянскім с/с – 1 [7, арк. 13].

Ужо з канца 1947 г. назіраюцца намаганні ўлад па аб’яднанні геаграфічна блізкіх стараверскіх абшчын на тэрыторыі Сіроцінскага раёна. Так, 18 снежня 1947 г. ад упаўнаважанага ССРК па БССР К. Уласевіча ў адрас старшыні Сіроцінскага райвыканкама паступіў загад аб закрыцці стараверскага малітоўнага памяшкання ў в. Сідараўшчына. У якасці аргументацыі закрыцця ўказвалася, што Сідараўшчынская абшчына была знята з рэгістрацыі. Прычынай зняцця стала тое, што на невялікай адлегласці ад яе ў в. Латкова ёсць стараверскі храм, “что вполне удовлетворяет религиозные потребности двух обществ”. Адначасова рэкамендавалася прапанаваць царкоўнаму савету Сідараўшчынскай абшчыны аб’яднацца з Латкоўскай [8, арк. 18]. У якасці яшчэ адной фармальнай прычыны зняцця з рэгістрацыі Сідараўшчынскай абшчыны ўказвалася тое, што раней яе прыхажане належылі да Латкоўскай (што не адпавядае фактам). Таксама ў якасці распаўсюджанай на той час прычыны стала адсутнасць у абшчыны храма (богаслужэнне адбывалася ў арэндуюмым жылым доме) [14, арк. 10]. Пры гэтым нават у афіцыйных справаздачах указвалася, што абшчына ўжо набыла зруб для будучага храма [14, арк. 10–11]. У выніку 5 лютага 1948 г. Сіроцінскі райвыканкам прыняў рашэнне аб закрыцці маленнай і спыненні дзейнасці абшчыны, а малітоўны дом мусіў быць перададзены сельскаму савету для выкарыстання яго пад культурна-асветніцкую ўстанову [9, арк. 2]. Мерапрыемствы па ліквідацыі стараверскіх аб’яднанняў у Сіроцінскім раёне прывілі да таго, што ўжо на пачатак 1948 г. тут засталіся дзейнічаць толькі 3 зарэгістраваныя абшчыны (у вв. Непароты (Плюшчоўка), Забор’е і Латкова), але і яны зведалі прыцясненні. З 10 лютага 1948 г. на іх была накладзена забарона на правядзенне богаслужэнняў, паколькі абшчыны не заключылі тыпавыя дамовы на малітоўныя памяшканні [9, арк. 4]. Аднак перашкоды па заключэнні дамоў на перадачу царкоўнай маёмасці ў карыстанне вернікаў чыніліся з боку раённых улад (райвыканкам не адпраўляў свайго ўпаўнаважанага заключаць дамовы). У адказ прадстаўнікі стараверскіх абшчын нават прыбылі ў Мінск са скаргай [9, арк. 10].

Нягледзячы на ўказанне ССРК на заключэнне дамоў, мясцовыя органы Сіроцінскага раёна гэтаму ўсяляк супраціўляліся. У якасці аргументацыі ў адмове на заключэнне дамоў указвалася тое, што да вайны ўсе гэтыя памяшканні належылі калгасам і толькі ў час вайны яны былі занятыя пад малітоўныя дамы, таму мясцовыя ўлады хадайнічалі аб адмене гэтага ўказання [9, арк. 12]. Пры гэтым былі падрыхтаваны адпаведныя даведкі, дзе гаварылася, што малітоўныя дамы вышэйпералічаных абшчын у даваенны перыяд былі ва ўласнасці калгасаў. Так, згодна з даведкай, Латкоўскі малітоўны дом займаў памяшканне калгаснага свірна, які быў перададзны немцамі ў перыяд акупацыі, а малітоўны дом, які займала стараверская абшчына ў в. Непароты, у 1939 г. быў перавезены з в. Плюшчоўка і прыстасаваны пад калгасны клуб. У 1942 г. у час акупацыі ён быў перададзены стараверскай абшчыне. У памяшканні, занятым стараверскай абшчынай в. Забор’е, да вайны размяшчалася школа, а ў час акупацыі яна была перададзена пад малітоўны дом [9, арк. 23]. Разам з тым, была падрыхтавана дакладная, у якой гаварылася, што ў Забор’і няма іншага памяшкання для школы [9, арк. 18]. У адказ на прашэнні мясцовых улад упаўнаважаны ССРК па БССР 13 сакавіка 1948 г. паведаміў, што ім былі ўжо раней аб’яднаныя абшчыны в. Жалудова (у той час ужо Ульскага р-на) і в. Забор’е зыходзячы з таго, што ў апошняй маецца малітоўны дом, аднак, паколькі ў Забор’і няма будынка для школы, то ён не супраць каб пад яе перадалі стараверскую царкву. У той жа час упаўнаважаны пастанавіў заключыць дамовы з абшчынамі ў вв. Латкова і Непароты [9, арк. 18]. У гэтым жа годзе малітоўны дом у в. Забор’е быў аддадзены пад школу [9, арк. 25], а ў хуткім часе стараверскія абшчыны ў вв. Латкова і Непароты таксама спынілі сваё афіцыйнае існаванне.

У пасляваенны перыяд значная колькасць старавераў пражывала ў межах Бешанковіцкага раёна. На яго тэрыторыі функцыянавалі тры стараверскія абшчыны (у вв. Застарынне, Плісы і Светагорава), якія размяшчаліся даволі блізка адна да адной (гл. малюнак 2). На працягу 1945–1946 гг. усе яны былі зарэгістраваны. Па даных на 1946 г. у Бешанковіцкім раёне дзейнічалі 11 стараверскіх могілак [7, арк. 14]. Як і ў выпадку з Сіроцінскім раёнам, ужо ў канцы 1947 г. прадпрымаліся спробы па закрыцці стараверскіх абшчын на тэрыторыі раёна. У выніку, усе тры абшчыны былі аб’яднаны ў адну з цэнтрам у в. Светагорава. Так, 18 снежня 1947 г. ад упаўнаважанага па БССР у адрас выканкама Бешанковіцкага р-на было накіравана пісьмо (амаль такое ж, як і ў адрас Сідараўшчынскай абшчыны Сіроцінскага р-на). У ім рэкамендавалася аб’яднаць абшчыны ў в. Плісы і в. Светагорава, паколькі ў першай адсутнічае асобнае малітоўнае памяшканне, а лесаматэрыял, які Пліская абшчына набыла для будаўніцтва царквы, рэкамендавалася перадаць мясцоваму сельсавету для пабудовы культурна-асветніцкай установы [8, арк. 19]. Выканкам Бешанковіцкага райсавета рашэннем ад 25 лютага 1948 г. спыніў дзейнасць стараверскай абшчыны ў в. Плісы [9, арк. 9]. У выніку Пліская абшчына была далучана да Светагораўскай. У 1950 г. Светагораўская абшчына была перарэгістравана [4, арк. 18] і праіснавала амаль да канца 1960-х гг. 18 снежня 1968 г. яна была знятая з рэгістрацыі, а памяшканне царквы мусілі перадаць пад патрэбы мясцовага клуба [4, арк. 83, арк. 79].

На тэрыторыі Чашніцкага раёна ў сярэдзіне 1940-х гг. дзейнічала тры стараверскія абшчыны (усе ў межах Цяпінскага с/с). З іх дзве абшчыны былі зарэгістраваныя ў 1946 г. (у в. Зазерыца і в. Бор). У той жа час абшчына

ў в. Должыца так і не была зарэгістраваная. На тэрыторыі раёна ў гэты час функцыянавалі 7 стараверскіх могілак [6, арк. 4]. У маі 1946 г. стараверы в. Должыцы таксама падалі заяву на рэгістрацыю абшчыны на адрас упаўнаважанага па Віцебскай вобласці з просьбай зарэгістраваць малітоўнае памяшканне ў прыватным доме: “так как наша церковь была сожжена в 1923 году и до этого времени церкви не имеется. Просим удовлетворить нашу просьбу, дать нам возможность исполнять свой обряд в дому Красавина Варфоломея Лукьяновича” [7, арк. 16]. Але, як сведчаць архіўныя матэрыялы, абшчына так і не была зарэгістравана. У хуткім часе спынілі сваю афіцыйную дзейнасць і абшчыны ў вв. Бор і Зазерыца.

Такім чынам, ужо з канца 1947 г. як з боку Савета па справах рэлігійных культаў па БССР, яго ўпаўнаважанага па Віцебскай вобласці, так і з боку мясцовых органаў улады назіраецца актыўная дзейнасць па закрыцці стараверскіх храмаў і спыненні дзейнасці іх абшчын. У выніку, у канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. па Віцебскай вобласці былі знятыя з рэгістрацыі абшчыны ў Ульскім р-не (в. Жалудова), Сіроцінскім р-не (вв. Добрына, в. Сідараўшчына, в. Латкова, пас. Шуміліна, в. Плюшчаўка, в. Забор’е), Бешанковіцкім р-не (в. Застарынне), Чашніцкім р-не (в. Бор, в. Зазерыца), у г. Віцебску (“Тарны камбінат”) і Віцебскім р-не (в. Грышаны) [10, арк. 6–6адв.]. Такім чынам, у 1954 г. па вобласці засталіся толькі дзве зарэгістраваныя стараверскія абшчыны: у г. Віцебску і в. Светагорава Бешанковіцкага раёна. Пасля ўваходжання ў гэтым жа 1954 г. у склад Віцебскай вобласці Полацкага раёна іх колькасць павялічылася да трох (дадалася абшчына ў г. Полацку). Згодна з афіцыйнымі данымі, у гэты час Віцебская абшчына налічвала 500 вернікаў, Полацкая – 60, Светагорская – 400 [15, арк. 84]. Згодна з афіцыйнымі данымі, на 1 студзеня 1955 г. па Віцебскай вобласці налічвалася 1 320 вернікаў-старавераў [16, арк. 22].

Нягледзячы на спыненне афіцыйнай дзейнасці, у 1950-я гг. многія стараверскія абшчыны працягвалі працаваць “нелегальна”. Па афіцыйных даных, у сярэдзіне 1950-х гг. у вобласці дзейнічалі тры незарэгістраваныя групы вернікаў: 1) стараверы-папоўцы ў г. Віцебску; 2) стараверы-беспапоўцы ў Сіроцінскім раёне; 3) стараверы ў вв. Бор, Должыца, Зазерыца Чашніцкага р-на. Згодна з інфармацыяй на 1957 г., агульная колькасць вернікаў гэтых трох груп складала 520 чалавек (200 з іх складалі стараверы-папоўцы ў г. Віцебску, 200 налічвалася ў Сіроцінскім раёне і яшчэ 120 чалавек у Чашніцкім раёне) [17, арк. 30]. Аднак такая іх колькасць падаецца заніжанай. У тых жа самых справаздачах упаўнаважанага сустракаем значна большую колькасць старавераў. Так, згодна з афіцыйнымі данымі, толькі ў Шуміліна ў гэты час пражывала каля 200 стараверскіх сем’яў [17, арк. 68], а ў в. Забор’е і в. Добрына Сіроцінскага р-на на вялікія святы на маленні збіраецца 150–200 чалавек [17, арк. 1].

Як вынікае з аналізу архіўных дакументаў, асаблівую актыўнасць у гэты час праяўлялі стараверы Сіроцінскага раёна. Нават прадпрымаліся спробы па аднаўленні дзейнасці храмаў і рэгістрацыі абшчын. Так, у в. Лоўжа Сіроцінскага р-на група вернікаў старавераў сабрала грошы, на якія набыла будынак пад малітоўны дом, і пачала набываць іконы, але райвыканкам забараніў афармляць будынак пад малітоўны дом і яго былі вымушаны прадаць [17, арк. 1–2]. У пасёлку Шуміліна ад імя старавераў звярталася група вернікаў з просьбай аб рэгістрацыі рэлігійнай абшчыны і набыцці ці арэнды памяшкання для малітоўнага дома. Упаўнаважаны рэкамендаваў звярнуцца ў райвыканкам, які ў просьбе дома адмовіў [18, арк. 68].

**Заключэнне.** Такім чынам, на аснове аналізу крыніц прыходзім да наступных высноў.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе тэрыторыя Паўночна-Усходняй Беларусі па-ранейшаму з’яўлялася важным цэнтрам стараверства. У рэгіёне ў гэты перыяд налічвалася значная колькасць стараверскіх абшчын, дзейнасць якіх аднавілася яшчэ у часы вайны. Усе яны размяшчаліся ў межах Сіроцінскага, Чашніцкага, Бешанковіцкага, Віцебскага раёнаў і г. Віцебска. Ва ўзаемаадносінах органаў улады і стараверскіх абшчын рэгіёна ў 1945 – сярэдзіне 1950-х гг. характэрны тыя ж тэндэнцыі, што і ў цэлым па СССР. Лібералізацыя дзяржаўна-рэлігійнага курсу ў першыя пасляваенныя гады прывяла да таго, што большасць стараверскіх аб’яднанняў Віцебскай вобласці атрымала афіцыйную рэгістрацыю на працягу 1945–1946 гг. (усяго было зарэгістравана 15 абшчын). Аднак з канца 1947 г. назіраецца ўзмацненне антырэлігійнай кампаніі ў краіне, што прывяло да зачынення стараверскіх храмаў і зняцця абшчын з рэгістрацыі (у шэрагу выпадкаў праз аб’яднанне ў адну геаграфічна блізкіх абшчын). Ужо на 1954 г. у межах Віцебскай вобласці засталіся дзейнічаць толькі дзве стараверскія абшчыны (у г. Віцебску і в. Светагорава Бешанковіцкага р-на), а пасля ўваходжання ў 1954 г. у склад вобласці Полацкага раёна іх колькасць павялічылася да трох (дадалася абшчына ў г. Полацку).

## ЛІТАРАТУРА

1. Гарбацкі А.А. Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. – Брэст: БрДУ, 1999. – 202 с.
2. Друзенок О.В. Старообрядческие объединения города Витебска в середине 1940-х – середине 1960-х годов // Пічэтаўскія чытанні – 2021: 100 гадоў БДУ – першаму ўніверсітэту Беларусі: матэрыялы міжнар. навук.-тэарэтыч. канф., Мінск, 27–28 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Д. Кароль (гал. рэд.) і інш.; навук. рэд. М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі. – Мінск: БДУ, 2021. – С. 226–232.
3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 149.
4. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 151.
5. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 152.
6. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 1.
7. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 2.
8. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 3.

9. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 4.
10. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 5.
11. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 6.
12. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 2. Спр. 1.
13. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 2. Спр. 2.
14. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 2. Спр. 3.
15. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 2. Спр. 4.
16. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 2. Спр. 5.
17. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 2. Спр. 7.
18. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 2. Спр. 8.

*Пастуніў 23.06.2022*

## СТАРООБРЯДЧЕСКИЕ ОБЩИНЫ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ В 1945 – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ 1950-х гг.

***В.Е. ОВСЕЙЧИК***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*Статья посвящена истории старообрядческих общин Витебской области в 1945 – первой половине 1950-х гг. На основе архивных материалов рассмотрено их состояние в первое послевоенное десятилетие. Этот период характеризуется неоднородностью государственно-конфессиональной политики в советском государстве. Если сразу после войны наблюдается восстановление религиозной жизни, то уже в конце 1940-х гг. наступает период ее свертывания. В статье проанализированы процессы восстановления религиозной жизни в старообрядческих общинах, рассмотрен процесс их официальной регистрации в данный период, выявлены изменения в государственной политике в отношении старообрядческих общин региона в конце 1940-х гг. Особенное внимание обращено на политику советской власти в вопросах закрытия старообрядческих храмов и прекращения деятельности общин в конце 1940-х – начале 1950-х гг. Охарактеризованы некоторые демографические показатели, рассмотрены особенности территориального размещения общин и расселения старообрядцев в северо-восточной Беларуси в первое послевоенное десятилетие.*

***Ключевые слова:*** *старообрядцы, религиозные общины, этнические группы, БССР, Витебщина, государственная политика.*

## OLD BELIEVER COMMUNITIES OF THE VITEBSK REGION IN 1945 – FIRST HALF OF 1950S

***U. AUSEICHYK***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article is devoted to the history of Old Believer communities of Vitebsk region in 1945 – first half of 1950th. On the base of archive materials their state in the first post-war decade is examined. This period is characterized by heterogeneity of the state-confessional policy in the Soviet state. If right after the war the restoration of religious life is observed, then already in the late 1940-s the period of its winding down is observed. The article analyzes the recovery process of religious life in the Old Believer communities, examines the process of their official registration during this period and reveals changes in public policy in relation to the Old Believer communities of the region in the late 1940s. Special attention is paid to the policy of Soviet power in the closing of the Old Believer churches and the termination of community activities in the late 1940s – early 1950s.*

***Keywords****: Old Believers, religious communities, ethnic groups, BSSR, Vitebsk region, state policy.*